Гродзенская гарадская цэнтральная
бібліятэка імя А.Макаёнка;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# “Скрамблевіч М.А. – беларускі музыкант, педагог, майстар”

Да 70-годдзя з дня нараджэння



Гродна, 2011

## Біяграфічныя звесткі.

Скрамблевіч Мар’ян Антонавіч нарадзіўся ў вёсцы Адэльск Гродзенскага раёна. Народны музыкант, майстар па вырабе народных духавых і ударных інструментаў. Скончыў Вышэйшую прафсаюзную школу ў Ленінградзе (1970). З 1963 настаўнічаў у Адэльскай сярэдняй школе, у 1970-2002 загадчык клуба ў Гродне. Валодае ігрой на гармоніку, юаяне, дудзе, дудцэ, жалейцы. Працуе як майстар-рэстаўратар і эксперыментатар па вынаходніцтве ў галіне гукавых якасцей гармоніка, мадыфікацый народных інструментаў. Вырабляе духавыя інструменты (дудка сапрана, акарына, альт, бас, паршнёўка, флейта пана, парная дудка, дуда, жалейка), ударныя інструменты (клякотка, кляшчотка, трашчотка, драбінка і інш.) Яго інструменты гучаць у прафесійных, аматарскіх і вучэбных фальклорных калектывах Беларусі, знаходзяцца ў музеях рэспублікі, прыватных калекцыях у Канадзе, Францыі, Аўстрыі, Германіі і іншых краінах.

## “…Святая к музыке любоў…”



Цікавая, што і казаць, рэч – наша жыццё. А што жыць на гэтым свеце сумна – няпраўда. І калі жыццё хаця б і умоўна прыняць, скажам, за аркестр, то выявіцца, што кожны з нас іграе ў ім на ўласным інструменце. Узяць таго ж Мар’яна Скрамблевіча. І партыя ў Мар’яна Антонавіча свая, і інструменты – адметныя. Уласнага вырабу. І, на шчасце, гэта не якія-небудзь цацкі, бутафорыя, забаўкі – а тое, што зусім не боязна назваць прыкметамі народнага духу.

Можа і не цяжка было б ўявіць, як пілуе, вырэзвае, габлюе, свідруе, здаецца, прыдатны толькі ў печ звычайны аскабалак дрэўніны майстар, каб потым узнік з нематы гук і пачаў здіўляць. Няйначай, закладзена ў гэтым дзействе ці чарадзействе свая тайна, і спасцігаюць яе адзінкі. Пра некаторых умельцаў гаворапь, што рукі ў іх залатыя. У дачыненні да гродзенскага майстра Мар'яна Скрамблевіча можна яшчэ дадаць: музычныя. Бо вырабляе Мар'ян Антонавіч каля 20 гадоў народныя музычныя інструменты. І не толькі вырабляе, а яшчэ ўмее падабраць мелодыю для кожнага "голасу" — акарыны, жалейкі, рогу, дудкі-свісцёлкі...



Акарыны ў майстра асаблівыя, вырабленыя не з традыцыйнай гліны або фарфору, а драўляныя: з акацыі, вішні, грушы, дубу, сасны, чаромхі, яблыні, вольхі. А інструментам з клёну і ліпы, як сцвярджаюць знаўцы, увогуле няма аналагаў у свеце.

Музыка і майстар-разьбяр, творца і выканаўца – у адной асобе! Нездарма нашы землякі занеслі яго імя ў спіс "7 цудаў" Гродзенскага раёна. Майстар-музыка з горада на Нёмане, мабыць, і сам цалкам не ўсведамляў, што стварае асабістую музычную легенду. І складаецца яна ў яго залатых руках з гуку і … дрэва, і памножаная на талент выканаўцы захапляе вока і слых.

## Дзяцінства.

З музыкай Мар'ян Скрамблевіч заручаны з маленства. Нарадзіўся ён у 1939 г. у мястэчку Адэльск. Тады гэта быў сапраўдны рамесніцкі цэнтр. Якімі тут толькі рамёсламі не займаліся!

Але асаблівай пашанай карысталіся музыкі-самавукі, якія не толькі ўмелі добра граць на гармоніку, цымбалах і дудачках, але і самі выраблялі гэтыя інструменты. Менавіта з гэтых вытокаў чэрпае натхненне самабытны музыкант, спявак, майстар народных інструментаў Мар'ян Скрамблевіч.Творчую жылку ён атрымаў з

генамі. У руках яго дзеда скрыпка спявала так, што дзівілася ўся акруга, бацька быў спрытным гарманістам, сваяк — арганістам. Брат Мар’яна Антонавіча выконвае дэкаратыўныя кампазіцыі з металлу з уключэннем шкла, каваныя брамы, краты, падсвечнікі, шрыфтавыя тэксты назваў станцый метро, устаноў, інтэр'еры, дробную пластыку. Сярод твораў: інтэр'екры станцый метро «Трактарны завод», гасцініцы «Беларусь», Рэспубліканскага Дому шлюбаў, рэзідэнцыі ўрада РБ, рытуальнай залы Дома афіцэраў у Мінску і інш. У выставах удзельтнічае з 1978 года (у Літве, Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Расіі). Аўтар шматлікіх публікацый на тэмы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

А Мар’яна адарыла прырода найбольш шчодра. Нездарма за здольнасць іграць адразу на некалькіх музычных інструментах, напрыклад, барабане, гармоні і падгалоску, яго называюць “чалавек-аркестр”.

А ў дзяцінстве іграў на ўсім, што пад руку трапляла і магло гучаць. Першым музычным інструментам былі дудкі, якія вырабляў з кары дрэў. Праўда, была ў хлопца мара - купіць баян - які ж музыкант без баяна. Яна збылася, але і па сённяшні дзень на дудцы іграе з асаблівым задавальненнем.

На лета з Гродна ў пошуках цішыні і натхнення ён перабіраецца ў бацькоўскую хату ў Адэльск. Тут амаль усё захавалася, як пры жыцці бацькоў, нават вытканыя матуляй дарожкі на падлогу. Знаёмыя з дзяцінства рэчы, здаецца, яшчэ захоўваюць бацькоўскае цяпло. Матуля з татам як жывыя на партрэтах, што ў рамках на сцяне. Калі б яны сапраўды маглі бачыць свайго сына, ганарыліся б: бацькоўскія надзеі спраўдзіў.

## Вучоба і праца.

Не ведаючы нотнай граматы, Скрамблевіч мог лёгка падабраць мелодыю на слых. Але талент, закладзены прыродай, безумоўна, трэба было абавязкова развіваць. Хлопец разумеў, што павінен вучыцца. Ён паспяхова скончыў аддзяленне тэорыі музыкі ўніверсітэта імя Крупскай у Маскве. Пазней музычнаму развіццю Мар’яна Антонавіча паспрыяла вучоба ў вышэйшай прафсаюзнай школе культуры ў Ленінградзе, харавое аддзяленне якой ён скончыў. На працягу 30-ці гадоў ён кіраваў самадзейным хорам і аркестрам Гродзенскага аўтапарка № 1.

Прызнаваўся лепшым клубным работнікам горада, неаднаразова быў узнагароджаны дыпломамі Рэспубліканскага фестывалю “Грай, гармонік!” і Міжнароднага фестывалю народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік”. Ды гэта толькі адна з граняў таленту Мар’яна Скрамблевіча. Яшчэ ў перыяд вучобы стварыў клуб аматараў музыкі і песні ў Гродзенскім аўтапарку. Хор аўтамабілістаў быў вядомы не толькі на Гродзеншчыне.




На біс успрымалі і сольныя нумары Мар’яна Скрамблевіча. Ён выконваў творы не толькі беларускіх аўтараў, але і польскіх, украінскіх, а таксама асабістыя.

Высокую ацэнку яго талент атрымаў на рэспубліканскім фестывалі “Беларусь — мая песня”, лаўрэатам якога ён прызнаны.

## Нараджэнне музыкі.

Той цудадзейны момант, калі звычайная кара дрэва ў руках пачынае спяваць, Мар’ян Антонавіч пранёс праз усё жыццё.

Успамінае, што яшчэ ў школьныя гады займаўся таксама рэстаўрацыяй музычных інструментаў. Менавіта тады для школьнага ансамбля, які стварыў, спатрэбілася скрыпка. Знайшлі інструмент, якому было амаль 90 год. Здавалася, “жыццё” яго ўжо назаўжды пакінула. А Мар’ян змог надаць скрыпцы новае дыханне. Не без радасці бярэ ў рукі гэты рарытэт майстар і зараз.

Аб адным шкадуе, што заняўся вырабам музычных інструментаў не ў маладым ужо ўзросце. Але, як кажуць, усяму свой час. Затое да гэтага набыў вопыт работы з дрэвам. У жыцці былі такія перыяды, калі будаваў дамы, рабіў вокны і дзверы. Яго першая драўляная табурэтка і зараз захоўваецца ў гарадской кватэры як добры знак пачатку важнай справы. Удзячны майстар гродзенскім токарам Мікалаю Пузыні і Мікалаю Смагіну, столяру Уладзіміру Кашко, якія дапамаглі зрабіць інструменты пад дрэваапрацоўку. Вось

ужо болей за 15 гадоў ён займаецца вырабам драўляных музычных інструментаў.

Працуе ён з рознымі пародамі дрэва: з клёнам, акацыяй, ясенем, чаромхай, сасной, дубам, рабінай, нават з індыйскім бамбукам. Каб інструменты добра гучалі, Мар'ян Антонавіч сушыць дрэва ў працягу пяці гадоў. А нарыхтоўвае драўніну майстар абавязкова восенню, бо, як лічыць ён, у гэтую пару дрэва нібы засынае, яго сок пераходзіць у карані. Цяжка паверыць, што звычайны драўляны кавалачак зможа зайграць. Нават з дрэва, ў якое стукнула маланка, можна зрабіць цудоўны інструмент. У сонечнае надвор'е ён будзе вельмі прыгожа гучаць, але ў пахмурную – не. Хіба гэта не цуд?

На самай справе музычны інструмент нараджаецца няпроста. Не адзін кіламетр пройдзе па лесе Мар'ян Антонавіч, пакуль не знойдзе патрэбнае дрэва. Затым яно сохне ў саломе не адзін год і толькі тады паддаецца майстру. Дробязей у гэтай справе не бывае. Важна нават, у якую пару года дрэва зрэзана.

Калі вясною, яно напоўнена сокамі, таму інструменты будуць гучаць плаксіва, а восенню, калі ўсе сокі прыняла зямля, гучанне атрымліваецца высокае. Майстар аддае перавагу інструментам, якія перадаюць радасць жыцця. Працуе над кожным інструментам даволі доўга – меняе таўшчыню сценак, велічыню адтулін, шліфуе гук і тэмбр. Затое кожная яго дудка мае сваю асаблівую меладычную афарбоўку і набліжаны да прыроднага каларыт – на іх можна перадаваць шум ветра і лістоты дрэў, птушыныя спевы. Здаецца, нібы таленавітая рука майстра вызваліла з драўніны нячутыя свету галасы.

Як кажа сам Мар'ян Антонавіч, навучанне ігры на народных музычных інструментах павінна быць абавязковым у дзіцячых музычных школах, школах мастацтваў, на факультатывах сярэдніх школ, факультэтах грамадскіх прафесій вышэйшых навучальных устаноў, гімназіях, ліцэях, педагагічных каледжах, гуртках і калектывах мастацкай самадзейнасці.

Народныя музычныя інструменты карысталіся вялікай папулярнасцю ў XVIII стагоддзі. Яны былі неад'емнай часткай аркестраў, хароў. Такія кампазітары як І.С. Бах, Г.Ф. Гендэль, Г.Ф. Талеман і многія іншыя ў сваіх творах выкарыстоўвалі народныя інструменты. У XIX стагоддзі інтарэс да іх некалькі знікае, і яны ўжываюцца толькі пры правядзенні народных ігрышч, гулянняў,

вяселля. І толькі ў другой палове ХХ стагоддзя адчуваецца патрэбнасць у захавванні традыцыйнай музычнай культуры і звяртаецца ўвага да народнай музыкі і народных музычных інструментаў.

Самабытны майстар стаў сапраўднай знаходкай для прафесійных і фальклорных калектываў Гродзеншчыны, такіх як "Гасцінец", "Белыя росы", "Дударыкі" і іншых. Яго інструменты знаходзяцца ў музеях рэспублікі, уласных калекцыях у Аўстрыі, Францыі, Германіі. Член Саюза народных майстроў Беларусі Мар'ян Скрамблевіч з'яўляецца лаўрэатам прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя Аляксандра Дубко, удзельнікам міжнародных конкурсаў. За асабісты ўклад у развіццё народнай творчасці і адраджэнне нацыянальных музычных традыцый яго імя занесена ў энцыклапедыю "Беларускі фальклор".

## І акарына загучала...



Дудкі, дуды, жалейкі, трашчоткі , кляшчоткі... — цяжка пералічыць усё багацце, якое сабрана ў музейным пакоі народных інструментаў майстра Скрамблевіча, які быў адчынены ў адэльскім Доме культуры. Але ёсць яшчэ адна каштоўнасць сярод інструментаў Мар'яна Антонавіча. Гэта – калекцыя драўляных акарын ў выглядзе птушак і рыб, нават адзіная ў Еўропе. З даўніх пор ва ўсім свеце яе ляпілі з гліны, выконвалі ў фарфоры. І Мар'ян Скрамблевіч на свой страх і рызыку асмеліўся паказаць свету драўляную акарыну. Гэты інструмент нагадвае па форме рыбу. У руках майстра акарына ператварылася ў сапраўднае цуда са сваім меладычным вобразам і воблікам. Дарэчы, апрача беларускіх нацыянальных інструментаў з'явіўся з-пад рук самабытнага майстра своеасаблівы — акарына (у перакладзе з італьянскага — "гусёнак").



Драўляны інструмент быў прызнаны спецыялістамі ў Еўропе. Вынік плённай працы высока ацанілі музыканты з Польшчы, Канады, Францыі, Германіі, Аўстрыі, Славакіі. Музычныя інструменты, выраблены Скрамблевічам, выстаўлены ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Пастаўскім музеі лесу, Варшаўскім музеі этнаграфіі. А Навагрудскаму музею Адама Міцкевіча ен падарыў вялікі паляўнічы рог, створаны ў гонар 200-годдзя Адама Міцкевіча паводле апісанага ў паэме “Пан Тадэвуш”.

Сёння на дудачках Мар’яна Скрамблевіча іграюць музыкі Беларускай акадэміі музыкі, БДУ культуры і мастацтваў, а таксама ансамбляў “Белыя росы”, “Гараднiца”, “Гуды”. Мар’ян Антонавіч стварыў нават музычную сям’ю акарын, кожная з якіх мае свой голас: бас, альт, сапрана, тэнар.

Мар’ян Антонавіч увесь час у творчым пошуку, увесь час эксперыментуе. Выступае ён і ў якасці кампазітара. А ў апошні час стварыў музычную кампазіцыю з ім жа апрацаваных песень перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

## Музей Мар’яна Скрамблевіча.



Збылася даўняя мара Мар’яна Скрамблевіча — сабраць свае інструменты ў адзінае цэлае,



адкрыць музейны пакой, куды маглі б прыходзіць людзі не толькі дзівіцца, але і вучыцца.
У 2009 годзе ў Адэльскім цэнтры культуры і народнай творчасці пачаў працаваць Музей драўляных музычных інструментаў Мар’яна Скрамблевіча. Кіруе ім сам майстар.

Наведвальнікаў сустракаюць словы: “І што ў душы аддаць паспею людзям – яно і ёсць быцця адвечны рух!”

## Сустрэча ў бібліятэцы.



На чарговае пасяджэнне пад назвай “Мір маіх захапленняў”, якое праходзіла ў філіяле № 10 ГЦБС клуба “Ветэран”, запрасілі Мар’яна Антонавіча Скрамблевіча. На сустрэчу ен прыйшоў са сваімі музычнымі інструментамі. Вельмі сціплы чалавек, ён ніколі не выстаўляе напаказ свае веды і ўменні. На сустрэчы Мар’ян Антонавіч паведаміў, як ён прыйшоў да музыкі, да стварэння музычных інструментаў, якія вядомыя не

толькі ў Беларусі, але далёка за мяжой. З дзяцінства займаўся музыкай, граў на ўсіх інструментах. Сваю музыку Мар'ян Антонавіч захоўвае ў памяці, можа доўга іграць і імправізаваць.

Многа інструментаў было адрэстраўрыравана. Сярод іх – 5 скрыпак XVII стагоддзя. Адна з іх аднаўлялась з кавалачкаў на працягу трох гадоў. Гэта скрыпка захоўваецца ў асабістым архіве майстра.



На сустрэчы ў філіяле № 10 Мар'ян Антонавіч іграў на гармоніке, які таксама рэстаўрыраваўся доўгі час. І цяпер гучыць па-асабліваму – ці то акардэон, ці то баян.

Доўгі час майстар ішоў да сваёй мэты. І часта сустракаў неразуменне. Але гэта не спыніла яго. Заснаваны ім хор у аўтакамбінаце № 1 г. Гродна доўгі час радаваў слухачоў сваёй творчасцю. Але Мар'ян Антонавіч хацеў іншага – хацеў вырабляць музычныя інструменты. І пасля распада СССР ён спачатку заняўся вырабам дудак. Яго захапленне ніхто сур'ёзна не ўспрымаў. Але майстар не спыніў сваёй работы. І вынік не прымусіў чакаць сябе.

Мар'ян Антонавіч неаднакратна ўдзельнічаў у выстаўках, на фестывалях у Гродна, Мінске, у гарадах Заходняй Еўропы. Неаднаразова паказваў сваё майстэрства на фестывалях "Славянскі базар" і "Дажынкі", якія штогод праходзяць у Беларусі.



Ён сустракаўся з дырэктарамі Брытанскага і Нарвежскага музеяў. Мар'ян Антонавіч Скрамблевіч прыняты ў члены Саюза народных майстроў Беларусі. Да яго прыязджалі карэспандэнты ОНТ, прадстаўнікі ўсім вядомага хора імя Пятніцкага, а таксама прадстаўнікі Варшаўскага універсітэта.

“Творчасць не павінна стаяць на месцы” - так лічыць творца. Гэты працэс увесь час развіваецца, удасканальваецца. Майстар увесь час у пошуку - з’яўляюцца новыя музычныя інструменты, ніводны не паўтараецца. І сёння на сваёй сядзібе Мар’ян Антонавіч Скрамблевіч робіць музей інструментаў, якія ён стварае.



На сустрэчы ў клубе “Ветэран” Мар’ян Антонавіч вельмі ахвотна расказваў пра сваю дзейнасць па вырабу інструментаў, іграў для прысутных асабістыя музычныя творы і беларускую народную музыку. Члены клуба з захапленнем слухалі майстра, спрабавалі іграць не некаторых музычных інструментах. Гучалі вершы ўдзельніка клуба “Ветэран”, паэта, прысвечаныя Мар’яну Антонавічу. Беларуская зямля багата таленавітымі людзмі. Яны жывуць і працуюць побач з намі. Вырабамі іх творчасці захапляюцца не толькі жыхары нашай краіны, але і за мяжой. І наша задача – захаваць для нашчадкаў цудоўны скарб дзейнасці чалавечых рук. Гэта – наша мінуўшчына, сучаснасць і будучыня.

## Бібліяграфія


1. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2т. Т 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – “Яшчур” / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – 832 с.: іл.
2. Скорабагатчанка, А. Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя: вучэб. дапам. / Альбіна Скрабагатчанка. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 398 с.
3. Скрамблевіч, Мар’ян. Народныя інструменты: дапаможнік кіраўнікам калектываў мастацкай самадзейнасці / Мар’ян Скрамблевіч. – Гродна: Упраўленне Гродзенскага аблвыканкама; ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, 2005. – 61 с.
4. Артемова, О. И птицы поют под дудочку мастера / О. Артемова // Гродзенская праўда. – 2006. – 19 кастр. – С. 5.
5. Гамина, В. Звуки Родины / В. Гамина // Перспектива (Гродненский район). – 2009. – 2 окт. – С. 2.
6. Голуб, Юрка. І лёс –аркестр, і сад – аркестр, і выканаўца здатны / Ю. Голуб // Гродзенская праўда. – 2001. – 23 чэрв. – С. 9.
7. Зубрицкая, М. Святая к музыке любовь / М. Зубрицкая // Перспектива (Гродненский район). – 2008. – 19 жн. – С. 14.
8. Ожегов, М. Веселись, деревня [Одельск] / М. Ожегов // Перспектива (Гродненский район). – 2009. – 22 июля. – С. 27.
9. Премии имени А. Дубко ["За творческие достижения в отрасли культуры и искусства"]: десятка лауреатов // Гродзенская праўда. – 2006. – 17 студз. – С. 2.
10. Пяткевіч, А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – 356 с.
11. Робак, С. Музей Мар’яна / С. Робак // Культура. – 2010. – № 9. - С. 12.
12. Шрубейка, К. На выставе – дудкі, жалейкі, трэмбіты… / К. Шрубейка // Перспектива (Гродненский район). – 2005. – 21 крас.
13. Юркавец, Г. Пра дудку пагудка / Г. Юркавец // Гродзенская праўда. – 2003. – 6 снеж. – С. 10.

Інтэрнет- рэсурсы:

1. Чалавек-аркестр. “У яго руках і саломінка зайграе”, — так кажуць землякі пра майстра-музыканта. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.21.by/papers?id=100124. – Загал. з экрана. – Мова бел., рус.

2. Мар’ян-музыка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.21.by/papers?id=100124. – Загал. з экрана. – Мова бел., рус.

## Дадатак 1.

## Прыпеўкі ад Адэльскай ЦКіНТ
## (прысвячаецца М.А. Скрамблевічу)

У Адэльску сення свята,
Рады мы ад усёй душы.
Гасцей сёння ў нас багата,
Дзякуй, што ў клуб прыйшлі.
Музеі розныя бываюць,
Музеі людзі адкрываюць.
Ганарымся мы спаўна
Такога, як у нас няма.
Мар’ян Антонавіч у нас
Словам, высшы пілатаж.
Уся рэспубліка Вас знае
І Еўропа запрашае.
Знакаміты наш зямляк,
Гэта добры вельмі знак.
Адэльск славіць на вякі.
Майстар наш, 100 год жыві!
Праспявалі вам прыпеўкі
Ну, вядома ж, ад душы,
Каб заўсёды былі з намі
І не ведалі бяды!

## Дадатак 2.

## МАРЬЯНУ АНТОНОВИЧУ СКРАМБЛЕВИЧУ

*С любовью и искренней благодарностью –*
*Участники клуба «ВЕТЕРАН»*
*Заседание клуба «Ветеран» 19.03.11г.*
*Праздник мастеров*
*«Я в мире моих увлечений»*

Играет дудочка судьбы
Портрет невидимый эпохи,
В ней ноты слышатся борьбы,
Любви таинственные вздохи.
Поймал рыбак в заливе дней
«Рыбёшку», пусть не золотую,
Но как играет он на ней
Свою мелодию простую.
Рог, что веками собирал
Князей со свитой на охоту,
Призывным эхом полнит зал,
Имея новую работу.
Мотивы мирной жизни сельской
Уже отчётливо слышны…
И за пределами Одельска,
И за пределами страны.
В шаги годов, где мало страсти
И в череду рабочих дней,
Вноси мажор, народный мастер,
Прекрасной музыкой своей!

П.Я.Семинский

# Дадатак 3.

Дудкі добра спалучаюцца з баянам, гітарай, скрыпкай, цымбаламі, з аркестрам народных інструментаў.

Чыстата інтанацыі гука залежыць ад внутранага слуху. Пры слабым паданні паветра гук заніжаны, а пры сільным – завышаны.

Самае простае гэта выдуванне на складах ту, ду, ку.




Мною распрацавана цэлая сістэма выраблення дудачак па строю ў два, тры, чатыры голаса. Яны прыгодны для стварэння ансамблевай, аркестравай ігры. Перад канцэртным выступленнем (рэпетыцыяй) неабходна разыграць іх 5 хвілін, затым падстроіць.



Дудкі ў складзе:

- Два сапрана і два тэнара
- Сапрана, альт і два тэнара
- Сапрана, альт, тэнар, бас.

Добра спалучаюцца з народным хорам, а таксама, калі гучыць не адна дудка, а ў складзе 10-12 выканаўцаў.

## Дадатак 3.
*Акарыны*









*Дудкі.*





*Дудкі-паршнёўкі*



*Клякотка*



*Паляўнічыя рогі*





Укладальнік: Бабраўніцкая І.Э
Рэдактар: Свірыда Н.Р.
Адказны за выпуск: Камарова М.А.